Паважаныя калегі!

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**
**МСЦІСЛАЎСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

***запрашаюць прыняць удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі***

# МСЦІСЛАЎ І МСЦІСЛАЎСКІ КРАЙ: ГІСТОРЫЯ, КУЛЬТУРА, ЛЮДЗІ

Плануемае праблемнае поле канферэнцыі

- Археалогія Мсціслаўскага края;
- Мсціслаўскае княства і князі Мсціслаўскія;
- Мсціслаўшчына ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
- Мсціслаў – цэнтр павета ў складзе Расійскай імперыі;
- Савецкая эпоха і падзеі Вялікай Айчыннай вайны;
- Захаванне культурнай прасторы і турыстычны патэнцыял Мсціслаўшчыны.

Час правядзення канферэнцыі **26–27 верасня 2019 г.**

Месца правядзення канферэнцыі **г. Мсціслаў Магілёўскай вобласці.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да **20 жніўня 2019 г.** па электроннай пошце: ***a_miacelski@tut.by,*** альбо ***andreika.miacelski60@mail.ru*** У заяўцы паведамляюцца імя, імя па бацьку, прозвішча, навуковая ступень і званне дакладчыка, назва даклада, пасада і месца працы, кантактны тэлефон, e-mail.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі і запрашэнне будуць дасланы да **1 верасня 2019 г.**

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Тэксты прадстаўляюцца ў аргкамітэт па электроннай пошце ***a_miacelski@tut.by,*** альбо ***andreika.miacelski60@mail.ru*** да **7лістапада 2019 г.** Патрабаванні да тэкстаў: электронны варыянты аб'ёмам да 30 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская, украінская.

*Кантакт*: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (017) 284-14-09, факс (017) 284-18-70; *Мяцельскі Андрэй Анатольевіч*, e-mail: ***a_miacelski@tut.by,*** альбо ***andreika.miacelski60@mail.ru.***

Арганізатары забяспечваюць бясплатнае пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў канферэнцыі. Выдаткі на праезд за кошт камандзіруючага боку.

**Аргкамітэт**